**Водгук**

**афіцыйнага апанента**

**кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта, загадчыка кафедры**

**дызайна моды Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**

**Атраховіч Алены Ігараўны**

**на дысертацыю А. М. Сінілы**

**«Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска»,**

на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

## 1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якім яна прадстаўлена да абароны

Дысертацыя суіскальніка А. М. Сінілы прысвечана даследаванню твораў жывапісу са збораў Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР.

Прадметам даследавання з'яўляюцца сюжэтна-тэматычныя асаблівасці твораў жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў. Зборы карцін згаданых музеяў у разглядаемы перыяд былі найбольш значнымі на тэрыторыі Беларусі і прадстаўлялі жывапіс розных перыядаў, школ і напрамкаў. Па сваймy зместу дысертацыя з'яўляецца мастацтвазнаўчым даследаваннем і адпавядае спецыяльнасці – 17.00.04 выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

## 2. Актуальнасць тэмы даследавання

Актуальнасць дысертацыйнага даследавання, зробленага А. М. Сінілам заключаецца ў неабходнасці выявіць сюжэтна-тэматычныя асаблівасці твораў жывапісу з даваенных калекцый найбуйнейшых музеяў Мінска, і тым самым ліквідаваць прагал у айчынным мастацтвазнаўстве, датычным

згаданых збораў, а таксама пошуках страчаных твораў і вяртанні іх у гісторыю беларускага мастацтва. На жаль, зрабіць такую працу, абапіраючыся на вывучэнне саміх карцін, якія ўваходзілі ў згаданыя зборы немагчыма ў поўнай меры ў выніку панесеных страт у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Адсутнасць інвентарных кніг Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР, пратаколаў закупак, актаў перадач і іншых дакументаў мінскіх музеяў прывяла да сітуацыі, калі доўгія гады ў прафесійным мастацтвазнаўчым асяроддзі Беларусі лічылася, што комплексна меркаваць пра жывапіс са згаданых збораў практычна нельга, і можна вывучаць толькі асобныя ацалелыя творы. Выйсце з гэтай сітуацыі бачыцца толькі адным шляхам – максімальнае аднаўленне складу калекцый праз аналіз і супастаўленне звестак з разнастайных крыніц, што і было зроблена аўтарам дысертацыі. Комплексны падыход да даследавання дазволіў паспяхова пераадолець вузкасць звычнага ўспрыняцця тэмы даваенных калекцый жывапісу музеяў Мінска, як немагчымай для паўнацэннага даследавання.

Прааналізаваўшы вялікую колькасць архіўных дакументаў, якія былі выяўлены ў айчынных і замежных архіўных сховішчах, даследчык атрыбутаваў шмат твораў жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, многія са “страчаных” карцін былі ім зноў уведзены ў навуковы зварот.

### 3. Ступень навізны вынікаў атрыманых у дысертацыі

Навуковая навізна безумоўна прысутнічае ў дадзеным дысертацыйным даследаванні і вызначаецца тым, што ўпершыню ў гісторыі беларускага мастацтвазнаўства былі выяўлены, сістэматызаваны і грунтоўна апісаны жанравая структура і тэматычна-вобразныя асаблівасці твораў беларускага і замежнага (заходнееўрапейскага і рускага) жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў. Дзякуючы карпатліваму вывучэнню нумароў, надпісаў, пячатак і этыкетак на захаваных творах жывапісу была складзена база пазначэнняў на карцінах з даваенных калекцый мінскіх музеяў, якая беспамылкова дазваляе даказаць паходжанне прадметаў з беларускіх

калекцый, прасачыць перамяшчэнні твораў і тым самым вярнуць творы выяўленчага мастацтва ў кантэкст беларускага мастацтвазнаўства, нават калі карціна апынулася ў замежных зборах.

У выніку даследавання А. М. Сінілам у шырокі зварот было ўведзена мноства раней невядомых твораў, многія з якіх лічыліся загінуўшымі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Сярод выяўленых карцін напрыклад сустракаюцца працы вядомых беларускіх, рускіх і італьянскіх мастакоў. Атрыбутавана больш за 100 твораў рознага жанру: вызначаны мадэлі на партрэтах, аўтары, паходжанне з пэўных прыватных калекцый, ці дзяржаўных устаноў, сучаснае месцазнаходжанне твораў у Беларусі і замежных краінах з даваенных калекцый музеяў Мінска.

## 4. Абаснаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі абгрунтаваны навукова і бясспрэчна маюць высокую ступень дакладнасці, дзякуючы ўважліваму аналізу ацалелых твораў жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, і вялікай колькасці крыніц, якія датычаць тэмы даследавання.

Дадатковая абаснаванасць палажэнняў і зробленых высноў абапіраецца на выкарыстаныя крыніцы на беларускай, рускай, польскай, нямецкай, украінскай і англійскай мовах (206 пазіцый), а таксама метадалогіяй і мастацтвазнаўчымі метадамі даследавання.

## 5. Навуковае і практычнае значэнне вынікаў дысертацыі з пазначэннем рэкамендацый па іх прымяненню

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў наступных высновах і абагульненнях:

– упершыню даказана, што Мінскі сацыяльна-гістарычны музей і Дзяржаўная карцінная галерэя БССР мелі найбольш значныя калекцыі

жывапісу, якія ў даваенны час з’яўляліся эталоннымі для іншых музеяў на тэрыторыі Беларусі;

– абгрунтавана, што фарміраванне калекцыі жывапісу Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР складалася на працягу 1919–1940 гг. і ўключала некалькі этапаў. Дзякуючы гэтаму перад Вялікай Айчыннай вайной калекцыі, якія даследуюцца ўяўлялі цэласны комплекс твораў нацыянальнага (беларускага і яўрэйскага), рускага і заходнееўрапейскага мастацтва; адлюстроўвалі ўсе этапы развіцця беларускага жывапісу, свецкае і царкоўнае мастацтва;

– вызначана жанравая структура твораў беларускага жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, якая ўключала шляхецкі партрэт з сямейных галерэй, прадстаўлены творамі прафесійнага і рамеснага мастацкага ўзроўню, датаваных XVII–XIX стст. Да беларускага жывапісу ў музейных зборах адносіліся карціны пейзажнага, анімалістычнага, гістарычнага жанраў, напісаныя мастакамі беларускага і яўрэйскага паходжання;

– дадзена характарыстыка тэматычна-вобразных асаблівасцей твораў замежнага жывапісу з даваенных збораў Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. Еўрапейскі жывапіс быў прадстаўлены пераважна творамі розных жанраў італьянскіх і галандскіх мастакоў, у меншай ступені ў калекцыі прысутнічалі карціны фламандскай, нямецкай і французскай школ перыядаў барока і класіцызма. Рускі жывапіс складаў істотную частку збораў і налічваў больш за 200 карцін, якія адлюстроўвалі рускае мастацтва жывапісу ад парсуннага партрэта да твораў мастакоў-авангардыстаў.

Практычнае значэнне дысертацыі, вынікае з паспяховага рашэння задач, пастаўленых перад даследчыкам. Вынікі дысертацыйнага даследавання А. М. Сінілы былі выкарыстаны на практыцы ў экспазіцыйнай, экскурсійнай і выставачнай дзейнасці Нацыянальнага музея-запаведніка «Нясвіж» (акт ад 20. 02. 2024 г.), Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі

(акт ад 17. 09. 2024 г.), Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль» (акт ад 20. 09. 2024 г).

Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі мастацтвазнаўчых прац па гісторыі даваенных калекцый жывапісу музеяў Мінска, у выставачнай і экскурсійнай дзейнасці, падрыхтоўцы тэматычных экспазіцый, атрыбуцыі твораў жывапісу.

Вынікі дысертацыйнага даследавання таксама можна прымяніць пры складанні баз дадзеных твораў, страчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны; пры пошуках зніклых карцін. У прыватнасці, навуковая база страчаных твораў са збору ДКГ БССР можа быць выкарыстана ў дзейнасці Камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

## 6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі

Асноўныя вынікі даследавання прадстаўлены ў 26 публікацыях агульным аб'ёмам 22,33 аўт. арк., якія былі выкананы аўтарам самастойна, у тым ліку ў 8 артыкулах у навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (4,88 аўт. арк.), 6 артыкулах у зборніках навуковых работ і часопісах (2,88 аўт. арк.), 8 матэрыялах канферэнцый (5,54 аўт. арк.), 1 даведачным выданні (8,5 аўт. арк.), 3 артыкулах у гістарычных і мастацкіх часопісах (0,53 аўт. арк.).

## 7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК

Дысертацыя і аўтарэферат А. М. Сінілы афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь. Істотным дапаўненнем да візуалізацыі тэкста з'яўляюцца дадаткі – выявы пазначэнняў на творах жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, фотаздымкі карцін, якія сёння знаходзяцца ў Беларусі і за яе межамі, а таксама страчаныя ў Вялікую Айчынную вайну.

## 8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка ступені кандыдата мастацтвазнаўства

Дысертацыя А. М. Сінілы, прадстаўленая на абарону, адпавядае навуковай кваліфікацыі на якую прэтэндуе суіскальнік у галіне мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

## 9. Заўвагі і пытанні па дысертацыі і аўтарэферату

Істотных заўваг па дысертацыі і аўтарэферату няма. Варта аднак адзначыць, што ў Главе 2 больш падрабязна апісаны шляхецкія партрэты і ў цэлым беларускі жывапіс, але вельмі мала згадак пра карціны яўрэйскіх мастакоў.

Таксама цікавяць адказы суіскальніка на наступныя пытанні:

1. Вы абралі для даследавання творы жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, ці знаходзіліся ў гэтых зборах абразы? І чаго было больш – карцін, ці абразоў?

2. Зыходзячы з тэксту дысертацыі бачна, што ў калекцыях жывапісу былі розныя творы па сваім мастацкім узроўні. Якія карціны на вашу думку з'яўляліся найбольш каштоўнымі, або якія можна аднесці да ўнікальных ці рэдкіх?

3. Ці ёсць перспектывы для далейшага вывучэння мастацкіх калекцый жывапісу са згаданых музеяў?

## 10. Заключная частка

Дысертацыя суіскальніка А. М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска», з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, адпавядае ўстаноўленым патрабаванням і сведчыць пра высокі навуковы патэнцыял аўтара.

На нашу думку, вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура можа быць прысвоена А. М. Сінілу за:

- выяўленне і сістэматызацыю жанравай структуры і тэматычна-вобразных асаблівасцей твораў жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў;

- складанне базы пазначэнняў на карцінах з даваенных калекцый мінскіх музеяў;

- увядзенне ў шырокі ўжытак мноства раней невядомых твораў жывапісу і архіўных дакументаў па тэме даследавання, якія дазваляюць значна лепей уявіць гісторыю беларускага мастацтва;

- атрыбуцыю больш за 100 твораў рознага жанру.

кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,
загадчык кафедры дызайну моды
факультэта сацыякультурных камунікацый
Беларускага дзяржаўнага універсітэта А.І.Атраховіч

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. начальника управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Е.И.Зинкевич
«___» ________ 20___ г.